Источник: **«Звязда» - 2012-09-18**

## Чартарыйскія. Знакаміты княжацкі род



**Чартарыйскія — вядомы княжацкі род герба "Пагоня", прадстаўнікі якога займалі высокія дзяржаўныя і адміністрацыйныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Існуе меркаванне, што род Чартарыйскіх вядзе сваё паходжанне ад Канстанціна Альгердавіча, сына Альгерда і Марыі Віцебскай, з дынастыі Гедымінавічаў. Княжацкі тытул атрымалі на Люблінскім сойме ў 1569 годзе, пазней гэты тытул быў пацверджаны ў іншых дзяржавах: у Аўстрыі ў 1785 годзе і Каралеўстве Польскім у 1819 годзе. Па сведчанні гісторыкаў (А. Грыцкевіч), асаблівае значэнне ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай мелі ў XVII стагоддзі, калі ўзначальвалі моцную групоўку магнатаў — "фамілію", якая ў другой палове XVII стагоддзя спрабавала правесці рэформы дзяржаўнага і эканамічнага ладу краіны. На Беларусі валодалі Лагойскам, Глускам, Карэлічамі, Шкловам, Асташынам, Камянцом.**

Пачынальнікам роду з'яўляецца князь Васіль, сынамі якога былі Іван, Аляксандр і Міхаіл — нашчадкі іх сталі заснавальнікамі пяці асноўных ліній Чартарыйскіх: лагойскай, валынскай, чартарыйскай, клеванскай і карэцкай.

Значны след у палітычным і эканамічным жыцці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай пакінулі браты *Іван, Аляксандр і Міхаіл Чартарыйскія* (арганізатары і ўдзельнікі змовы і забойства вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча), *Сямён Чартарыйскі* (намеснік камянецкі, стараста чачэрскі і прапойскі), *Аляксандр Фёдаравіч Чартарыйскі* (ваявода валынскі), *Мікалай Юрый Чартарыйскі* (ваявода падольскі і валынскі), *Міхаіл Юрый Чартарыйскі* (ваявода брацлаўскі, валынскі і сандамірскі), *Казімір Чартарыйскі* (падскарбій ВКЛ, падканцлер ВКЛ),*Міхал Фрыдэрык Чартарыйскі* (канцлер ВКЛ, стараста гарадзенскі, гомельскі, купішскі, кашталян віленскі), *Адам Казімір Чартарыйскі* (пасол некалькіх соймаў, маршала Надзвычайнага сойма, рэфарматар войска ВКЛ, генерал-лейтэнант, атрымаў ад імператара Іосіфа II тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі).

Чартарыйскія былі не толькі добрымі палітыкамі, але і актыўна займаліся літаратурнай і навуковай дзейнасцю. Князі мелі багатую бібліятэку, якая была вядома яшчэ ў XVII ст. Ізабэла Чартарыйская заснавала першы ў Польшчы музей у Пулавах (Люблінскае ваяводства). У музеі захоўваліся нават два мячы з Грунвальдскай бітвы. Адам Чартарыйскі быў мецэнатам, апекуном літаратуры і мастацтва, тэатральным і літаратурным крытыкам, сам пісаў літаратурныя творы. Ён з'яўляўся пажыццёвым прэзідэнтам літаратурнага і гістарычнага таварыстваў. На працягу ўсяго жыцця Адам Чартарыйскі збіраў кнігі і рукапісы, якімі папаўняў сваю бібліятэку ў Пулавах. З мэтай папаўнення бібліятэкі рэдкімі выданнямі ў свой час набыў бібліятэку саксонскага пасла

ў Пецярбургу. Яго намаганнямі ў 1810 годзе ў Стакгольмскай Каралеўскай бібліятэцы набыты збор кніг і рукапісаў айчыннай тэматыкі. Адам Чартарыйскі быў заснавальнікам (1838) эмігранцкай бібіліятэкі ў Парыжы. Уладзіслаў Чартарыйскі быў старшынёй гісторыка-літаратурнага таварыства ў Парыжы.




Два прадстаўнікі роду былі далучаны да ліку блаславёных Рымскім Папам Іаанам Паўлам II: у 1999 годзе — Чартарыйскі Міхаіл, у 2004 — Чартарыйскі Аўгуст.

**Паходжанне прозвішча**

У пісьмовых крыніцах замацаваліся тры варыянты прозвішча: *Чартарыйскія, Чартарыскія, Чартарыжскія.* Родавае прозвішча з'явілася ў XV стагоддзі. Паходжанне прозвішча не выклікае ніякіх сумненняў: яно ўзнікла ад назвы родавага ўладання *Чартарыйск* (над ракой Стыр у Луцкім павеце, што на Валыні). У сваю чаргу назва паселішча *Чартарыйск* паходзіць ад назвы воднага аб'екта *Чартарыя*. Існуюць розныя версіі адносна паходжання слова *чартарый*: найбольш верагодна, што гэта слова з'яўлялася ўсходнеславянскім (пераважна рускім і ўкраінскім) геаграфічным тэрмінам, які служыў для абазначэння доўгага паглыблення, выкапанага ў зямлі, рова, канавы, яра. Як правіла, равы, яры выступалі ў якасці рысы, мяжы ўладанняў. У некаторых усходнеславянскіх гаворках *чартарыем* таксама называецца балота. У XIX стагоддзі слова *чартарый* вучоныя тлумачылі як геаграфічны тэрмін, які абазначаў імклівую плынь, што прабівала, расчышчала сабе дарогу. Магчыма, такімі прыкметамі характарызавалася рака, назва якой пазней была перанесена на назву паселішча, а затым замацавалася і ў якасці прозвішча. У народнай этымалогіі такую асаблівасць ракі звязвалі з дзейнасцю міфічнай істоты: нібы чорт прарыў.

**Нашчадкі Чартарыйскіх або аднафамільцы?**

Нягледзячы на тое, што прадстаўнікі роду Чартарыйскіх валодалі шматлікім населенымі пунктамі на беларускіх землях, у асновах беларускіх тапонімаў гэтае прозвішча не адлюстравалася. У чатырох раёнах Беларусі зафіксавана прозвішча *Чартарыйскі* (Лагойскі і Смалявіцкі раёны) і яго варыянт Чартарыцкі (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці, Талачынскі раён Віцебскай вобласці). Улічваючы сучасную тэрыторыю бытавання прозвішча Чартарыйскі і гістарычныя звесткі пра ўладанні славутага роду, цалкам можна дапусціць, што носьбіты гэтага прозвішча, якія жывуць на Лагойшчыне, маюць пэўную сувязь з княжацкім родам. У іншым выпадку магчыма, што носьбіты гэтага прозвішча з'яўляюцца выхадцамі з іншых усходнеславянскіх (украінскіх і рускіх) земляў — тых тэрыторый, дзе засведчаны геаграфічны тэрмін *чартарый* і ўтвораныя на яго аснове тапонімы.

Афіцыйна засведчана, што нашчадкі Чартарыйскіх у наш час жывуць у Польшчы і краінах Заходняй Еўропы.

**Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных**
**навук, вучоны сакратар**
**Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа**
**і Янкі Купалы НАН Беларусі**